# Іконы стылю мадэрн

**Нетрадыцыйныя выявы дэманструе Мастацкая галерэя «Універсітэт культуры». Госці ўстановы ўбачаць работы творцаў з Польшчы, Украіны і Беларусі — вынікі міжнародных майстар-класаў іканапісу ў мястэчку Навіцы.**

Падчас адкрыцця экспазіцыі «Святочныя іконы» кіраўнік праекта Матэуш Сора распавёў пра творчыя сустрэчы, якія праходзяць штогод у Польшчы. Пленэры збіраюць іканапісцаў з розных краін. Сярод іх — не толькі заслужаныя майстры, але і тыя, хто толькі пачынае спасцігаць гэты складаны від мастацтва. Кожны ўдзельнік павінен напісаць ікону ў вельмі кароткі тэрмін — меней чым за два тыдні. Працу творцаў суправаджаюць канферэнцыі і дыскусіі. Абмеркаванні прысвечаныя галоўным іканаграфічным тэмам — прадстаўленню Хрыста, Багародзіцы, пасланцаў Божых, анёлаў і прарокаў.

Выстаўка збірае іконы розных канфесій. Вядомыя біблейскія сюжэты: «Уезд Гасподні ў Іерусалім», «Раство Хрыстова», «Пакроў Багародзіцы», «Сашэсце Святога Духа» і іншыя паўстаюць перад гледачамі ў новым абліччы. Выявы маюць нетрадыцыйную форму, многія належаць да незвычайных стыляў. Абразы хаваюць шматлікія таямніцы і сімвалы. Каб зразумець іх — трэба ўглядацца, разважаць.

Меркаванне пра іканапіс як мастацтва застылае з'яўляецца памылковым. Сучасныя майстры прапануюць новыя аўтарскія канцэпцыі, пашыраюць сімволіку колераў. У работах ёсць месца і векавым традыцыям, і эксперыменту. «Аўтары прытрымліваюцца аўтэнтычных тэхналогій і канонаў і ў той жа час выкарыстоўваюць сучасныя мастацкія рашэнні», — пракаментаваў экспазіцыю Аляксандр Шымбалёў, кіраўнік аддзела адукацыі і катэхізацыі Мінскай епархіі.

Іканапіс — складаная і працаёмкая справа, якая патрабуе ад мастака высокага майстэрства. Ён павінен мець асаблівы дар, быць асобай духоўнай. Раней іконы пісалі выключна манахі ды святары. Сёння да стварэння выяў далучаецца ўсё больш мастакоў, у тым ліку моладзь. Майстар-класы ў Навіцах наведалі больш як 50 чалавек, а працы, створаныя ў мястэчку, убачылі тысячы гледачоў на пасляпленэрных выстаўках ў Варшаве, Луцку, Львове і іншых гарадах.

— Ікона — гэта адчыненая Біблія, якая нясе святло і цеплыню людзям. Калі чалавек піша ікону, ён становіцца бліжэй да Бога. Прыемна, што з кожным годам цікавасць да гэтай светлай справы расце, — зазначыў пробашч касцёла святых Сымона і Алены Уладзіслаў Завальнюк. Па заканчэнні выстаўкі некаторыя работы будуць падараваныя цэрквам і касцёлам.

**Ганна ПАЛЯКОВА**



*Аляксей Доўнар (Беларусь) «Укрыжаванне».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ